УДК 947.6 «1955/1965»

# СТАНОВІШЧА ПРАВАСЛАЎНАЙ ЦАРКВЫ Ў БЕЛАРУСІ Ў 1950-1960-Я ГГ.

**Юргевіч Н. К.**
УА «Віцебская дзяржаўная акадэмія ветэрынарнай медыцыны»
г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь

Сярэдзіна 1950-х - пачатак 1960-х гг. – складаны этап у гісторыі адносін дзяржавы і праваслаўнай царквы ў Беларусі. Час адносна мірнага суіснавання, які ўстанавіўся ў пасляваеннае дзесяцігоддзе, у 1950-1960-я гг. змяніўся палітыкай "ваяўнічай нецярпімасці" з боку дзяржавы ў дачыненні да царквы і рэлігійных абшчын. І гэта адбывалася ў той час, калі ў грамадстве назіраліся пэўныя зрухі да дэмакратызацыі грамадска-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага жыцця пасля XX з'езда КПСС (1956 г.). Аднак гэта не датычылася рэлігійнага жыцця. Мэта даследавання – на аснове матэрыялаў архіваў і навейшых публікацый паказаць дзяржаўную палітыку ў Беларусі ў адносінах да праваслаўнай царквы ў сярэдзіне 1950-1960-я гг.

У сярэдзіне 1950-х - сярэдзіне 1960-х гг. дзяржавай рабіліся спробы перабудаваць карэнным чынам царкоўнае жыццё, адхіліць духавенства ад адміністрацыйных, фінансава-гаспадарчых спраў у рэлігійных аб'яднаннях. Ліквідаваліся ільготы для святароў у адносінах да падатку, сацыяльнае абслугоўванне грамадзянскага персаналу царквы, перакрываліся накірункі дабрачыннай дзейнасці царквы. Вялікая ўвага надавалася змяншэнню ўплыву рэлігіі на падрастаючае пакаленне. Знаходжанне непаўналетніх на рэлігійных службах разглядалася як парушэнне заканадаўства аб культе [1, арк. 159; 2, арк. 23].

Шэраг пастаноў канца 1950-х гг. адзначалі памылковасць папярэдняй палітыкі ў адносінах да царквы. Пацвердзіць гэта можна пастановамі Савета Міністраў СССР ад 16 кастрычніка 1958 г. "О монастырях СССР", "О налоговом обложении доходов предприятий епархиальных управлений, а также доходов монастырей". Прынятыя меры па скарачэнні зямельных участкаў царквы, павышэнні падаткаў значна пагоршылі матэрыяльнае становішча царквы. Быў уведзены адменены ў 1945 г. падатак на пабудовы [2; 3, арк. 1, 20].

Аднак манастыры заставаліся цэнтрамі духоўнага жыцця, месцамі масавага паломніцтва людзей і абмена інфармацыяй аб царкоўным жыцці. У 1960 г. былі закрыты Гродзенскі і Полацкі жаночыя манастыры [4]. У 1963 г. Жыровіцкая семінарыя спыніла навучальную дзейнасць, так як мясцовыя ўлады разгарнулі працу аб утрыманні маладых людзей ад паступлення ў семінарыю. У многіх прыходах не



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

стала хапаць святароў. Вынікам ідэалагічнай працы мясцовых улад стала масавае закрыццё малітоўных будынкаў і храмаў: так, з 1961 г. дазвалялася закрываць малітоўныя будынкі па рашэннях абласных выканкамаў пры ўзгадненні з Саветам па справах Рускай праваслаўнай царквы і рэлігійных культаў пры Савеце Міністраў СССР, што аблегчыла працэс закрыцця храмаў. Больш храмаў, чым у іншых рэспубліках, страціла Беларусь, дзе колькасць цэркваў з 1959 г. па 1962 г. скарацілася з 944 да 732. Значныя змены адбыліся ў статусе і арганізацыі прыходаў. Кіраванне ў прыходах было перададзена выканаўчаму камітэту, які павінен быў вырашаць усе фінансавыя і гаспадарчыя пытанні [4]. Так, у дадзены перыяд кіраўніцтва многіх раёнаў ініцыявала правядзенне кампаніі па знядцы крыжоў, якія былі ўстаноўлены ў населеных пунктах і вёсках, на перакрыжаваннях дарог. Такія факты вымушалі рэагаваць веруючых у шэрагу месцаў: яны звярталіся з хадайніцтвамі аб вяртанні святыняў абшчынам, рамонце за свае грошы будынкаў, каб улады дазволілі праводзіць у іх службы і інш. Калі гэта не атрымоўвалася, у некаторых месцах узнікалі нелегальныя рэлігійныя арганізацыі [4].

Такім чынам, наступленне на рэлігію ў БССР узмацнілася ў сувязі са зваротам улад рэспублікі ў саюзныя органы з мэтай пераўтварыць яе ў першую “бязбожную” рэспубліку СССР. Толькі за 1960-1964 гг. у БССР спынілі дзейнасць 508 храмаў (53,6 %). На 1 студзеня 1965 г. налічвалася 420 храмаў, большасць прыпадала на заходнія вобласці [5]. Самай сумнай старонкай гісторыі 1950-1960-х гг. стала знішчэнне закрытых храмаў: былі ўзарванымі ў 1957 г. Мікалаеўскі сабор, у 1961 г. – Дабравешчанская царква ў Віцебску [2]. Нягледзячы на барацьбу ўлад з рэлігійнасцю насельніцтва, яна заставалася высокай, нават па заніжаных паказчыках [7, арк. 78].

**ЛІТАРАТУРА**


1. Совет по делам религиозных культов при СМ СССР по Витебской области. 1958 г. // Государственный архив Витебской области (ГАВО). – Фонд 4029. – Оп. – 1. – Д. 9.
2. Уполномоченный Совета по делам религиозных культов при Совете Министров СССР по Витебской области. 1958 г. // ГАВО. – Фонд 4029. – Оп. – 1. – Д. 9.
3. Уполномоченный Совета по делам религиозных культов при Совете Министров СССР по Витебской области. 07.01.1955-03.12.1955 г. // ГАВО. – Фонд 4029. – Оп. – 1. – Д. 13.
4. Канфесіі на Беларусі (к. 18 – 20 стст.) / В. В. Грыгор’ева, У. М. Завальнюк, У. І. Навіцкі, А. М. Філатава; нав. рэд. У. І. Навіцкі. – Мінск, 1998. – 340 с.
5.Степаненко, Н. И. Религии и неокультовые организации на Витебщине. – Витебск, 2004. – 164 с.
6.Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 6. Беларусь у 1946-2009 гг. / Л. Лыч [і інш.]; рэд. калегія: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2011. – 728 с.
7. Уполномоченный Совета по делам религиозных культов при Совете Министров СССР по Витебской области. 1961 г. // ГАВО. – Фонд 4029. – Оп. – 1. – Д. 13.




РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ